*Моладзь*

# Важна, што маладыя людзі клапоцяцца пра будучыню Беларусі

***Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава сустрэлася са студэнтамі Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта.***

Правядзенне сустрэчы ў Савеце Рэспублікі ініцыіравалі самі студэнты. Размова з Наталляй Качанавай праходзіла ў фармаце дыялогавай пляцоўкі, дзе прысутнічала амаль 40 актывістаў. Маладыя людзі задавалі пытанні, звязаныя з дыстанцыйнай адукацыяй і размеркаваннем, расказвалі аб студэнцкім жыцці, цікавіліся змяненнямі, якія плануюцца ў заканадаўстве, выказвалі свае прапановы.

"У мяне заўсёды самыя лепшыя ўражанні пасля сустрэч з моладдзю. Тым больш што сёння прыехалі юнакі і дзяўчаты з Навапалацка, Полацка, якія вучацца ў тым жа ўніверсітэце, дзе некалі вучылася я. Тады гэта быў Наваполацкі політэхнічны інстытут. Я бываю ў гэтым універсітэце. Праўда, са студэнтамі даўно ўжо не сустракалася, таму гэта сустрэча для мяне вельмі важная, — расказала Наталля Качанава. — Мне было прыемна паразмаўляць з юнакамі і дзяўчатамі, даведацца, якія тэмы іх хвалююць, якія ў іх ёсць праблемы, чым яны жывуць сёння. Іх пытанні тычыліся развіцця адукацыі ў нашай краіне, псіхалагічнай дапамогі, распрацоўкі законапраектаў, што немалаважна. Атрымліваючы сваю спецыяльнасць, яны ўжо жывуць тымі прапановамі, інавацыямі, якія трэба прадугледзець у той ці іншай галіне. Гэта было прыемна пачуць".

У час сустрэчы Старшыня Савета Рэспублікі чарговы раз пераканалася, што многія студэнты, атрымліваючы адукацыю ва ўніверсітэце, працуюць ужо. "Гэта значыць, яны сёння не проста вучацца і чакаюць, калі будуць недзе працаўладкаваны, а яны ўжо знайшлі свае месца і, працуючы, атрымліваюць адукацыю. На мой погляд, гэта вельмі важна, што маладыя людзі думаюць пра сваю будучыню і клапоцяцца аб тым, якой будзе наша краіна ў перспектыве", — дадала яна.

Студэнтка ПДУ Карына Хамянок падзялілася з журналістамі, што сустрэча ёй запомніцца надоўга. "Мне вельмі спадабалася экскурсія, якую для нас правялі члены Савета Рэспублікі. Было цікава паглядзець збоку, як развівалася верхняя палата парламента, даведацца аб гісторыі будынка, у якім знаходзімся. У час сустрэчы з Наталляй Качанавай не было закрытых тэм. Студэнты змаглі выказаць сваё меркаванне абсалютна па любым пытанні", — сказала яна.